**І. В. Грабянчук**

# ПАРТЫЗАНСКАЯ БАРАЦЬБА З НАЦЫСЦКАЙ ПАЛІТЫКАЙ ЭКАНАМІЧНАГА ГЕНАЦЫДУ НА АКУПАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1941–1944)

Пасля таго як напрыканцы лета 1941 г. германскія войскі захапілі ўсю тэрыторыю Беларусі, акупацыйная адміністрацыя актыўна праводзіла палітыку эканамічнага рабавання паняволенай краіны. Яна мела выразны каланіяльны ўхіл. Для рабавання і падрыву гаспадарчага патэнцыялу Беларусі існаваў

спецыяльны штаб “Ольдэнбург”, які каардынаваў збор неабходнай акупантам прадукцыі. У Германію вывозілі каштоўнае абсталяванне з прадпрыемстваў, прадукты харчавання, лесаматэрыялы і інш. У Беларусі было высечана больш за 100 тыс. гектараў лесу. У Рэйх адправілі 90 % станочнага і тэхнічнага абсталявання, больш за 9 тыс. трактароў, каля 20 тыс. аўтамашын. У сувязі з правядзеннем аграрнай палітыкі акупанты абʼявілі ўсю калгасную маёмасць маёмасцю Германіі. Яны абрабавалі 10 тыс. калгасаў, 92 саўгасы. У Германію вывезлі больш за 1,6 млн. т збожжа, каля 430 тыс. т мукі, значную колькасць бульбы і гародніны [1, с. 184].

Відавочна, што маштабы эканамічнага генацыду ў Беларусі былі б значна большымі, калі б тут не разгарнуўся масавы супраціў акупацыйнай палітыцы. Змест прааналізаваных намі нямецкіх трафейных дакументаў сведчыць пра тое, што якраз гэты фактар нацысцкія ўлады з самага пачатку акупацыі не маглі яшчэ належным чынам улічыць.

Выбудоўваючы эканамічныя планы на будучыню ў ліпені 1941 г., акупанты не ўяўлялі наколькі цяжкім будзе іх ажыццяўленне з-за партызанскага і падпольнага руху на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Галоўную небяспеку яны бачылі ў тым, што калі будзе ўрэзаны ліміт на тую нязначную колькасць аўтамабіляў (звычайна 6–10 штук), якія прызначаліся для гаспадарчых каманд, то праблемным стане захаванне і зберажэнне найважнейшых відаў сыравіны “і запасаў і іншага дабра”, паколькі ў такім выпадку яны будуць выкарыстаны часцямі вермахта і насельніцтвам [2, арк. 15–16].

Германскія акупанты былі ў першую чаргу заклапочаны захаваннем ураджаю 1941 г. у сваіх інтарэсах. Вярхоўнае камандаванне вермахта (ОКВ) у адным з сваіх загадаў выказвала задавальненне ў сувязі з тым, што сяляне ў нязначных памерах выконваюць “загад Масквы аб знішчэнні дамоў, машын і ўраджаю”. Галоўную небяспеку акупанты бачылі ў актыўнасці “фанатычнай сталінскай моладзі”, якая выказвала жаданне падпальваць склады і свірны з засыпаным у іх зернем пасля ўборкі ўраджаю і нават ажыццявіла падпал у Віцебску [3, арк. 11].

Тыя контрпрапагандысцкія захады, якія прымала ОКВ у мэтах аховы ўраджаю, былі прызнаны недастатковымі, таму акупанты стаўку зрабілі на рэпрэсіўныя падыходы. Яны вырашылі ўскласці адказнасць за моладзь пэўнай воласці на бургамістра гэтай воласці, папярэдзіўшы, што ў выніку найменшай праявы антынямецкага дзеяння будуць прыняты бязлітасныя меры пакарання. Само насельніцтва павінна было ахоўваць найбольш каштоўныя свірны і іншыя гаспадарчыя пабудовы. Любая спроба сабатажу або нават падазрэнне на яго падлягалі найстражэйшым пакаранням [Там жа, арк. 12].

Аднак спадзяванні акупантаў на тое, што такія жорсткія захады прывядуць да поўнага ўціхамірвання захопленай імі Беларусі не спраўдзіліся. Галоўнай перашкодай на гэтым шляху стаў партызанскі рух. Зразумела, ён не адразу набыў масавы характар. Восенню 1941 – зімой 1942 гг. ён перажываў

найскладанейшы перыяд у сваім развіцці; колькасць партызанаў на ўсёй тэрыторыі Беларусі была найменшай, таму тады яны яшчэ не маглі эфектыўна змагацца з палітыкай эканамічнага генацыду нямецкіх акупантаў.

Вясной-летам 1942 г. пачалася маштабная актывізацыя партызанскага руху ў Беларусі. Пра гэта красамоўна сведчыць наступная цытата з нямецкага дакумента: "Наступленне цяпла прывяло да такога пагрозлівага абвастрэння бандыцкай абстаноўкі на тэрыторыі групы армій "Цэнтр", якое яшчэ не мела месца за ўсю рускую кампанію… Настаў час, калі тэрмін "банды" зжыў сябе, цяпер больш правільна было б казаць аб рэгулярным другім фронце" [4, арк. 19–20] (падкрэслена ў тэксце дакумента).

Нямецкія ўлады з трывогай паведамлялі ў Берлін, што з-за актыўнай дыверсійнай дзейнасці партызан летам 1942 г. дастаўка харчавання з сельскай мясцовасці ў гарады станавілася практычна немагчымай. Яны былі занепакоены, што гэта небяспека нават ставіла пад пагрозу зрыву і ўсё харчовае забеспячэнне вермахта.

Устаноўлены на 1942/43 г. план нарыхтоўкі цурак для газагенератарных машын у 700 000 куб. м. акупанты вымушаны былі знізіць да 200 000 куб. м. У чэрвені 1942 г. яны значна скарацілі высечку і сплаў лесу з-за актыўнай дзейнасці партызан. План нарыхтоўкі лесу ў тым месяцы быў выкананы толькі на 70 %. Узніклі вялікія цяжкасці ў забеспячэнні заводаў круглым лесам. Па прызнанні нямецкага інспектара, гэта задача можа быць выканана толькі напружаннем "усіх сіл рабочых". У чэрвені 1942 г. партызаны разбурылі 9 лесапільных заводаў. Сплаў лесу па Бярэзіне быў магчымы толькі на вузкім адрэзку на поўнач ад Бабруйску: "Тут сплаў лесу яшчэ неяк падтрымліваецца: сплаўшчыкі на плытах плывуць да месц, якія знаходзяцца пад партызанскай пагрозай, а затым саскокваюць з плытоў, пакідаючы іх плыць сваім ходам, або штурхаюць іх з берага, а потым, прайшоўшы небяспечныя мясціны, зноў вяртаюцца на плыты" [5, арк. 100].

Партызаны значна ўскладнілі акупантам здабычу торфу. З 48 торфапрадпрыемстваў 21 торфазавод знаходзіўся пад пастаяннай пагрозай іх нападзення. Некаторыя з іх сістэматычна выводзіліся са строю дыверсіямі і актамі сабатажу, што выклікала неабходнасць закрыцця гэтых заводаў. Рабочыя торфазаводаў харчаваннем не забяспечваліся. У некаторых мясцовасцях каля 40 % рабочых не выходзілі на працу, а часткова збеглі [Там жа, арк. 100–101].

Пачынаючы з вясны і да пачатку ліпеня 1942 г. партызаны спалілі 8 лесапільных заводаў. У галіне хімічнай прамысловасці пачаў зрывацца план вытворчасці запалак у сувязі з тым, што ў выніку партызанскай дзейнасці значна быў абцяжараны падвоз драўніны на запалкавыя фабрыкі і забеспячэнне дровамі электрастанцый.

У перыяд з 1-га па 30-га мая 1942 г. партызанамі разбурана 6 ільнозаводаў, адзін завод заняты партызанамі і 2 ільнозаводы пашкоджаны імі. У якім стане знаходзіліся астатнія 22 ільнозаводы акупанты не мелі дакладнай інфармацыі. Пры гэтым яны не сумняваліся, што частку гэтых прадпрыемстваў можна лічыць разбуранамі [Там жа, арк. 98].

Па іншых гаспадарчых накірунаках, паводле нямецкага дакумента, паўстае наступная карціна: “Мы вымушаны былі спыніць і шэраг тэкстыльных фабрык, якія не ахоўваліся, у раёне Бабруйска у сувязі з пагрозай партызан разбурыць іх, калі яны будуць працягваць працаваць. Адпраўленыя у Барысаў спецыяўлісты па поўсці з-за партызанскай небяспекі не змаглі прыступіць да працы.

Папяровая фабрыка ў Чашніках у цяперашні час не можа быць ўведзена ў эксплуатацыю, паколькі існуе небяспека, што ў такім выпадку неадкладна будзе знішчана. Мы вымушаны былі спыніць працу папяровай фабрыкі ў Барысаве, паколькі партызанамі разбураны лесапільны завод на Бярэзіне.

Калі ў першыя месяцы пачатку года харчовае забеспячэнне працоўнага насельніцтва было больш ці менш дастатковым, то ў чэрвені месяцы ў многіх камандах узніклі цяжкасці з забеспячэннем харчаваннем працуючых. Дасягнута дамоўленасць з шэф-групай сельскай гаспадаркі аб харчовым забеспячэнні рабочых торфазаводаў часткова ў выніку партызанскай дзейнасці не была рэалізавана. Бульба у цяперашні час нават для войск выдаецца па норме, а то і наогул войскі яе не маюць. А таму цалкам зразумела, што для грамадзянскага насельніцтва бульба не выдаецца. Па гэтай прычыне былі вымушаны зачыніць вялікую колькасць заводскіх сталовак, паколькі ў іх выдаваўся толькі хлеб і зерне” [5, арк. 98–99].

Партызаны ажыццявілі шмат нападаў на гаспадарчыя прадпрыемствы вермахта і падпарадкаваныя яму прадпрыемствы (малочныя пункты, спіртзаводы, рамонтныя майстэрні, тэлефонныя станцыі і інш.): за красавік – 73, май – 143, чэрвень – 135, ліпень – 145, усяго – 496. Статыстыка нападаў на прадпрыемствы не падпарадкаваныя вермахту выглядае так: за красавік – 477, май – 722, чэрвень – 988, ліпень – 344, усяго – 2 511 [4, арк. 2–3].

Партызанская актыўнасць звузіла магчымасці рэалізацыі яшчэ аднаго накірунку нацыскага эканамічнага генацыду на акупаванай тэрыторыі Беларусі, а менавіта вывазу насельніцтва на работы ў Германію: “З усёй Беларусі паступаюць паведамленні, што начальнікі пунктаў вярбовачнай камісіі насельніцтва на работы ў Германію амаль нікога не вярбуюць. Цягнікі для адпраўкі завярбованых адмяняюцца або адпраўляюцца напаўпустымі. Указанні вярбовачнай камісіі ў заходніх абласцях Беларусі вярбаваць там перш за ўсё польскае насельніцтва выклікалі абвастрэнне з упраўленнем лясной гаспадаркі, якое ў гэтых абласцях знаходзіцца выключна ў польскіх руках. Нягледзячы на тое, што, з аднаго боку, нельга адмаўляцца ад выкарыстання палякаў у якасці рабочых на лесанарыхтоўках, з другога боку, з кожным днём праяўляецца іх палітычная нядобранадзейнасць і супрацоўніцтва з партызанамі” [6, арк. 27].

Пра крызіснае становішча з мабілізацыяй рабочай сілы для рэйха сведчаць наступныя лічбы. Калі ў красавіку 1942 г. немцы змаглі адправіць у Германію 5 000 рабочых, то ў маі месяцы – толькі 4 000 чалавек, а ўстаноў-

леная квота прадугледжвала адпраўку 30 000 чалавек штомесяц [5, арк. 21]. Яшчэ адно сведчанне наяўнасці ў акупантаў значных праблем у гэтай сферы: “Біржы працы паведамляюць, што патрэба ў рабочай сіле значна ўзрасла. Ваенным установам патрабуецца рабочая сіла ў велізарнай колькасці для ваенна-гаспадарчых прадпрыемстваў, маставога і дарожнага будаўніцтва, чыгункі і будаўніцтва аэрадромаў” [5, арк. 86].

У такой сітуацыі акупанты разгарнулі маштабныя карныя аперацыі супраць партызан і мірнага насельніцтва. З справаздачаў пра іх правядзенне можна даведацца, што карнікі шмат нарабавалі ў насельніцтва матэрыяльных каштоўнасцяў ў выніку правядзення аперацый “Хорнунг” у лютым 1943 г. [6, арк. 96], “Фён” у сакавіку 1943 [Там жа, арк. 28], “Шнеехазе” у студзені-лютым 1943 г. [Там жа, арк. 100]. Пра захопленых для адпраўкі ў Германію людзей у дакументах нічога не гаворыцца. Аднак больш маштабныя карныя акцыі такую задачу выконвалі. Летам 1943 г. нацысты правялі дзве вялікія аперацыі пад кодавымі назвамі “Котбус” і “Герман”. У першым выпадку было “захоплена рабочай сілы: мужчын – 4 997 чал., жанчын – 1 056 чал.” [7, арк. 72]. У другім – захоплена 9 065 мужчын, 7 701 жанчын, 4 178 дзяцей [Там жа, арк. 77]. Змест вывучаных архіўных дакументаў з фонда 1440 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь сведчыць пра тое, што карная аперацыя “Герман” зацягнулася да верасня-кастрычніка 1943 г. Падлік лічб, якія прыводзіліся ў штодзённых справаздачах з 27 верасня 1943 г. па 17 кастрычніка 1943 г., паказвае, што ў тыя дні карнікі захапілі для адпраўкі ў Трэці рэйх 19 153 чалавекі (з іх мужчын – 9 493 чал., жанчын – 6 131 чал., дзяцей – 3 529 чал.) [7, арк. 213–252]. Летам 1944 г. “істотны ўклад у пакрыццё патрэбы ў рабочай сіле мелі вынікі аперацый супраць банд, праведзеных на тэрыторыі 3-й танкавай арміі”. Тады акупанты змаглі захапіць 8 512 мужчын і 7 120 жанчын [Там жа, арк. 253]. Але ж, відавочна, у 1944 г. ім рабочая сіла патрэбна была ўжо не для адпраўкі ў Германію, а для ўзвядзення абарончых умацаванняў.

Для раскрыцця тэмы дадзенага артыкула істотнае значэнне мае пошук адказу на пытанне: у якой ступені нацысцкай акупацыйнай адміністрацыі ўдавалася рэалізоўваць свае эканамічныя планы ва ўмовах пастаяннага партызанскага супраціву? Каб даць поўны адказ на такое пытанне, патрэбна прааналізаваць шырокае кола крыніц. Пакуль разгледзім яго на прыкладзе таго, што на сёння ўдалося выявіць у архіўных матэрыялах.

У справаздачы сельскагаспадарчага аддзела адміністрацыі гебітскамісара Слуцка ад 4 верасня 1942 г. паведамляецца, што Слуцкая акруга павінна была паставіць Рэйху наступную колькасць прадукцыі: збожжа – 17 тыс. тон, бульбы – 34 тыс. тон, сена – 11 тыс. тон, саломы – 23 тыс. тон. На момант напісання справаздачы было нарыхтавана толькі 4 тыс. тон сена, з якіх 3 тыс. тон адгрузілі непасрэдна на армейскія склады забеспячэння, а 1 тыс. тон размеркавалі па асобных нарыхтоўчых пунктах у раёне. Пры гэтым, нягледзячы на тое, што склады ахоўваліся салдатамі вермахта і мяс-

цовымі паліцэйскімі, два з іх спалілі партызаны, знішчыўшы 350 тон сена. Тое ж сена, якое заставалася ў сціртах у балоцістай мсяцовасці, зімой неабходна было выкарыстаць для задавальнення мясцовых патрэб [6, арк. 140].

Улічваючы ўсе неспрыяльныя фактары – шмат балот і лясоў, партызанскія дыверсіі – сельскагаспадарчы інспектар Слуцкага гебітскамісарыяту скарэктаваў планы пастак Рэйху да канца 1942 г. наступным чынам: “10 тыс. т. збожжа, 30 тыс. т. бульбы, 6 тыс. т. сена, 10 тыс. т. саломы” [Там жа, арк. 141]. Як бачым, новыя лічбы моцна адрозніваюцца ад першапачаткова запланаваных.

Акупанты спадзяваліся, што добрыя надзеі на ўраджай ім забяспечаць 20 “дзяржаўных маёнткаў”. Аднак, са скрухай адзначае інспектар, гэтыя маёнткі спальваюцца адзін за другім, так што засталіся толькі дзве гаспадаркі, якія працуюць непасрэдна каля г. Слуцка. Не лепшым чынам для акупацыйных улад справы складваліся і ў сферы жывёлагадоўлі. З маёнткаў, якія размяшчалія бліжэй да лесу, партызаны забралі ўсю жывёлу і нават племянную, завезеную з Германіі. Таму слуцкі сельскагаспадарчы інспектар прыходзіць да несуцяшальнай высновы: “Усякая нарыхтоўка жывёлы нават у вёсках можа быць праведзена толькі прымусовымі мерамі з прымяненнем паліцыі і вермахта. Нават і ў гэтых выпадках часцяком рэквізаваную жывёлу партызаны адбіваюць назад” [Там жа, арк. 141].

Трэба адзначыць, што поспехі беларускіх партызанаў у барацьбе з эканамічным генацыдам нацысцкіх акупантаў даваліся няпроста. Здаралася, што яны неслі сур’ёзныя страты. Напрыклад, у чэрвені 1942 г. на поўдзень ад Барысава немцы ажыццявілі нападзенне на дастаткова буйны партызанскі атрад, які налічваў каля 300 чалавек. У выніку было забіта 136 чалавек, у тым ліку і камандзір атрада; 10 партызан патрапілі ў палон. Акупанты разбурылі 3 лясныя лагеры і захапілі вялікія трафеі: каля 400 тон бульбы, 3 тыс. тон збожжа, 1 500 галоў маладняка, 800 авечак, 700 свіней. Таксама партызаны панеслі значныя страты на паўночны захад ад Слуцка. Немцы нават сцвярджалі, што “сярод забітых знаходзіўся камандуючы бандамі ў генеральскай форме” [6, арк. 55].

Такім чынам, актыўны партызанскі супраціў ствараў шматлікія праблемы нацысцкім акупантам у ажыццяўленні іх палітыкі эканамічнага генацыду на акупаванай тэрыторыі Беларусі. У іх узнікалі вялікія лагістычныя праблемы пры распараджэнні рознымі матэрыяльнымі рэсурсамі, зрываліся планы паставак неабходнай прадукцыі і вывазу людзей на прымусовыя працы ў Германію. Улік запасаў ураджаю і іншых прадуктаў рабіўся для немцаў ўсё больш цяжкім. Асабліва цяжка ім было гэта зрабіць ў тых выпадках, калі дзясяткі тысяч гектараў “…карыснай плошчы знаходзяцца пад уплывам бандытаў, якія цалкам не прыгодныя для забеспячэння харчаваннем” [8, арк. 20]. Так гітлераўцы называлі партызанскія зоны. Сама гэта фармулёўка вельмі выразна раскрывае грабежніцкую сутнасць эканамічнай палітыкі нацыскіх акупантаў. Яны з трывогай сачылі за звесткамі, якія паступалі з розных раёнаў, пра тое, што вялікія партызанскія групы утварылі

штабы забеспячэння з бойнямі, шавецкімі майстэрнямі, прыёмнымі пунктамі збожжа і інш. Фактычна, партызаны стваралі паралельную эканамічную рэальнасць на акупанавай тэрыторыі Беларусі.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Коршук, У. К.* Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны / У. К. Кошук // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мінск : БелЭН, 2000. – С. 180–190.

2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 937.

3. НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 931.

4. НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 932.

5. НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 936.

6. НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 946.

7. НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 937.

8. НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 958.